НЯЎЛАСНА-ПРОСТАЯ МОВА, спосаб перадачы чужаслоўя, пры якім асноўныя лексічныя, фразеалагічныя, сінтаксічныя сродкі чужога выказвання захоўваюцца, а граматычныя паказчыкі змяняюцца. Паказчыкам чужаслоўя з'яўляецца змест і ўнутраная структура чужога выказвання. Непасрэдна з аўтарскага выкладу няўласна-простая мова ўзнікае часцей за ўсё ў тых выпадках, калі гэтым спосабам перадаецца не сапраўдна выказанае, а думкі, развагі персанажа, так званае "ўнутранае маўленне". Напрыклад: *Патупаўшы колькі ў пакоі, пасунуў ураднік за дзверы, падаўся на сваім буланым дахаты, увесь час крыўдуючы на свой лёс. То ж жыццё, можна сказаць… Ты душой і целам, і на табе: заместа падзякі, той гаварыць з табой не хочуць. Старайся вот тут, здароўе псуй з мужыччом гэтым, надрывайся дарэмна. А галоўнае – хоць бы табе які шэлег медны, дарма цэлага дня пратупаў* (М. Лынькоў). Няўласна-простая мова можа ісці пасля канструкцый з ускоснай мовай як яе працяг. Гэта тлумачыцца блізкасцю няўласна-простай і ўскоснай мовы. Абодва спосабы перадачы чужаслоўя маюць аднолькавае паходжанне і падобныя прыметы – замены форм асабовых дзеясловаў і займеннікаў. Аўтарская мова можа ўводзіць няўласна-простую мову пры дапамозе дзеясловаў, што абазначаюць маўленне і думку або паказваюць на характар, сітуацыю, пры якой адбываецца маўленне, а таксама пры дапамозе аддзеяслоўных назоўнікаў, блізкіх па значэнні да дзеясловаў маўлення і думкі: *Пыхкае дзед Талаш люлькаю, выпускаючы дымок за дымком. Клубочкі дыму працэджваючыся праз яловыя лапкі, выбіваюцца на прастор і гінуць у зімнім паветры, а сам дзед думае ды разважае. Паразважаўшы, прыходзіць да думкі, што пагарачыўся. Добра яшчэ, што Максім утрымаў яго за рукі, – было б горай, каб ён засёк жалнера. І невядома, што сталася б з яго сынамі і бабкаю Настаю… Ох, паганцы! І нагнаў жа іх чорт на яго галаву. І як было іначай рабіць з імі? Прасіў, маліў іх, як добрых, станавіўся на калені, а яны толькі здзекаваліся з яго, як бы ён і не чалавек* (Я. Колас). *Увесь час не выходзіў з галавы Хакімаў. Вядома, напаткуцца з ім не дай бог, асабліва пры пераходзе лініі фронту. Цяпер з ім не ўскочыш, не рванеш на лыжах, трэба ўсё паўзком, па-пластунску. Але хоць бы прайшлі. Праўда, Дзюбін, напэўна, сумее, павінен прайсці. Дзюбін і растлумачыць начальніку штаба іх няўдачу, неяк апраўдаецца за групу і за яе камандзіра. Хаця пры чым камандзір? Хто мог падумаць, што за якіх два тыдні так многа зменіцца, і немцы вывезуць базу* (В. Быкаў).

Няўласна-простая мова можа выступаць і як самастойная канструкцыя, якая не мае з папярэднім кантэкстам спецыяльных сродкаў сувязі, напрыклад: *Гэта вестка моцна ўразіла Лабановіча. Няўжо гэта праўда? Андрэй Лабудзька, той самы Лабудзька, чыё прозвішча так блізка стаяла да яго прозвішча ў спісе, няўжо ён памёр? Ці можа гэта быць?* (Я. Колас).

Няўласна-простай мове можа папярэднічаць простая мова і наадварот: *Вапшчэткі, а ты бачыў, каб работнікі былі не людзі? – глуха спытаў Ігнат. Ён ужо закіпаў: хопіць гэтых дурных жарцікаў* (А. Кудравец); *Я не памыліўся – яна тут новая, не толькі ў гэтым корпусе, а наогул у санаторыі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дагэтуль працавала ў анкалагічнай бальніцы, за дваццаць год нагледзелася ўсяго. Муж на адказнай рабоце; сын ужо кандыдат. А пра сябе: "Ну, як сказаць? Проста сваю работу люблю " (Я. Брыль).

Няўласна-простая мова (незалежна ад таго ці яна перадае чужое выказванне ці ўласнае ўнутранае маўленне) мае ў сваім складзе нямала слоў і выразаў з эмацыянальнай афарбоўкай непасрэдна сказанага. У адных выпадках больш, у другіх менш выяўляюцца адносіны аўтара да таго, пра што гаворыць ці думае персанаж. Тут можа быць і замілаванне, і спачуванне, і насмешка, і нават сарказм. Няўласна-простая мова – гэта шырока ўжывальны спосаб перадачы чужога выказвання, калі аўтар як бы гаворыць за свайго героя, але так, што ў яго мове адчуваецца аўтарская пазіцыя. Выразная і яркая, эмацыянальная і вобразная, не абцяжараная ўмоўнасцямі простай і ўскоснай мовы няўласна-простая мова натуральна і арганічна ўваходзіць ў аўтарскую мове, ажыўляе апавяданне. Усё гэта дае магчымасць шырока выкарыстоўваць няўласна-простую мову ў творах мастацкай літаратуры ў якасці асобага стылістычнага прыёму для ўнутранай характарыстыкі персанажаў.

С.С.Мароз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ